# Піянерская паляна




## Выпуск 2

ЛІСТАПАД
—
СНЕЖАНЬ
2020

# Карысныя канікулы



Кожны з нас з нецярплівасцю чакаў вакацый, каб больш часу надаць сваім любімым справам. У школе заўсёды знойдзеш, чым заняцца, нават і ў час канікул. У перыяд восеньскіх канікул у школе працавалі аб'яднанні па інтарэсах, секцыі, дзе дзеці маглі з карысцю правесці свой вольны час.

Для вучняў 2-11 класаў былі арганізаваны і праведзены цікавыя выхаваўчыя мерапрыемствы.





Для вучняў 2-4 класаў былі праведзены: дыстанцыйная гульня "Заваёўнікі вяршыняў", творчы конкурс "Восеньскія цуды-сваімі рукамі", акцыя "Кніга-твой сябар".

Вучні 5-8 класаў прынялі ўдзел у экалагічным калейдаскопе "Зямля-наш агульны дом", канкурснай гульні "Разгадаць сакрэты слоў", гадзіне этыкету "Твары дабро".



Вучні 9-11 класаў прынялі ўдзел у раённых спаборніцтвах па настольным тэнісе. Класны кіраўнік 11 класа Швайка Т.У. правяла з вучнямі конкурс "З родным словам-круглы год", а класны кіраўнік 10 класа Гардзей Г.М.— дыскусію "Прабачаць-значыць паважаць".

Кожны з вучняў, атрымаўшы зарад бадзёрасці і энергіі на вакацыях, з новымі сіламі прыступіў да вучобы.

***Швайка Вольга, член БРСМ***

# З павагай да энергазберажэння

У мэтах прыцягнення ўвагі грамадскасці да рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і развіцця аднаўляльных крыніц энергіі, Рэспубліка Беларусь 11 лістапада 2008 года падтрымала і далучылася да святкавання міжнароднага Дня энергазберажэння. Гэтае свята атрымала статус міжнароднага, паколькі прыняць удзел у праекце пажадалі каля 20 краін.

Наша школа таксама падтрымала ідэю энергазберажэння, і вучні разам з класнымі кіраўнікамі правялі Тыдзень энергазберажэння.



На працягу тэматычнага тыдня вучні 11 класа правялі акцыю "Беражы свет, цяпло, ваду!" Старшакласнікі на асабістым прыкладзе паказалі малодшым школьнікам, як неабходна беражліва выкарыстоўваць ваду, захоўваць цяпло і берагчы электрычнасць. Педагог-арганізатар Пан В.В. правяла сярод вучняў 5-8 класаў анкетаванне "Што я ведаю аб энергазберажэнні". Аналіз паказаў, што рабяты ведаюць, як правільна сартаваць другасную сыравіну, эканоміць ваду, прыродныя рэсурсы. Творчы конкурс "Эканомія і бервражлівасць" аб'яднаў вучняў 2-5 класаў. Дзеці намалявалі плакаты, малюнкі, дзе адлюстравалі свой погляд на беражлівыя адносіны да прыроды. Напрыканцы, кожны вучань атрымаў інфармацыйную лістоўку з парадамі па энергазберажэнню.

***Папека Анастасія, член БРСМ***

# Бацькоўскі ўніверсітэт. Бацькоўскі сход.

Арганізацыя і правядзенне бацькоўскіх сходаў з'яўляецца адным з накірункаў рэалізацыі праекта "Бацькоўскі ўніверсітэт". Згодна плана ва ўстанове ў снежні праведзена дадзенае мерапрыемства. На сходзе бацькі разам з класнымі кіраўнікамі абмеркавалі тэму "Супрацоўніцтва школы і сям'і па пытаннях прафілактыкі супрацьпраўных паводзін". Класныя кіраўнікі паведамілі бацькам аб змяненнях у заканадаўстве адносна непаўналетніх, а менавіта, адказнасць за ўдзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах, мітынгах, нагадалі аб адказнасці бацькоў за супрацьпраўныя ўчынкі непаўналетніх.

У кожным класе класныя кіраўнікі абмеркавалі пытанне арганізацыі і правядзення навагодніх ранішнікаў, нагадалі бацькам аб мерах прафілактыкі вірусных захворванняў.

Не засталіся без увагі і пытанні выхавання дзяцей у сям'і. Бацькам паведамілі аб бацькоўскім аўтарытэце, аб стылях выхавання ў сям'і.







***Дубоўская Дзіяна, член БРСМ***

# ШКОЛА АКТЫЎНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

**ШАГ 3. "Мы ў сучаснай медыяпрасторы: павага, бяспека, дакладнасць».**

26 лістапада ва ўстанове для вучняў 8-11 класаў прайшла адзіная гадзіна інфармавання ШАГ 3 на тэму "Мы ў сучаснай медыя-прасторы: павага, бяспека, дакладнасць".

Вучні 8-11 класаў падчас інфармацыйнай гадзіны абмеркавалі магчымасці сучаснай медыяпрасторы. Асаблівая роля ў медыяпрасторы надаецца СМІ, што з'яўляецца часткай сістэмнай дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі.

У 8-9 класах класны кіраўнік Дрозд Наталля Аляксандраўна распавяла вучням пра медыякультуру і яе ўплыў на асобу і грамадства. Наталля Аляксандраўна звярнула ўвагу на асаблівасці ўспрымання, выкарыстання і перадачы інфармацыі рознымі людзьмі. Вучні выказалі меркаванні, што роля мас-медыя ў сучасным грамадстве вялікая і аказвае вялікі ўплыў на сацыялізацыю і развіццё асобы не толькі навучэнца, але і дарослага чалавека.

У 10-11 класах класны кіраўнік Гардзей Галіна Мікалаеўна абмеркавала з вучнямі пытанні інфармацыйнай бяспекі непаўналетніх. Падчас дыялогу ўвага надавалася ўплыву Інтэрнэту на асобу. Вучні пазнаёміліся з такімі паняццямі, як "груминг", "кибербуллинг", "буллицид", "кибермошенничество". Кожнае з гэтых паняццяў звязана з уплывам сацыяльных сетак, што ўплывае на паводзіны падлетка. Каб не стаць ахвярай, вучні падзяліліся парадамі са сваімі аднагодкамі.

У канцы інфармацыйнай гадзіны кожны вучань зрабіў выснову, што інфармацыя, якую яны атрымліваюць павінна быць асэнсаванай і карыснай.





**ШАГ 4. “Я родным краем ганаруся і ведаю — я не адзін”**

Ва ўстанове прайшла адзіная гадзіна інфармавання для вучняў 8-11 класаў ШАГ 4 на тэму “Я родным краем ганаруся і ведаю – я не адзін”.

Класны кіраўнік Дрозд Н.А. разам з вучнямі 8 і 9 класаў разгледзелі і абмеркавалі інфармацыйны блок “Марафон добрых спраў – наш уклад у развіццё малой радзімы”. У час гутаркі ўвага надзялялася развіццю малой радзімы. Гэта прырода, родны дом, школа, родная вёска са сваімі гістарычнымі і культурнымі аб’ектамі, людзі, якія праславілі вёску далёка за яе межамі. Наталля Аляксандраўна паведаміла дзецям, якія мерапрыемствы рэспубліканскага ўзроўню праводзяцца ва ўстанове адукацыі. Гэта конкурсы, праекты, фестывалі. Вучні разам з настаўнікам абмеркавалі прыказку “Дзе нарадзіўся – там і згадзіўся”. Кожны расказаў аб тым, якую карысць можна прынесці сваёй сям’і, школе, вёсцы самастойна і, аб’яднаўшыся са сваімі сябрамі.

***Папека Анастасія, член БРСМ***





**ШАГ для вучняў 5-7 класаў**
**«Я І ШКОЛА»**

"Актыўны грамадзянін ўсведамляе сябе членам супольнасці, імкнецца спалучаць асабістыя і грамадскія інтарэсы, добра выхаваны, дысцыплінаваны, умее сябраваць, імкнецца да новых ведаў", - з гэтым знаёміла вучняў 5-7 класаў класны кіраўнік 5 класа Сайко Таццяна Анатольеўна . Падчас інфармацыйнай гадзіны вучні не толькі гутарылі, не толькі дзяліліся сваімі меркаваннямі, як трэба паводзіць сябе ў школе, з якой мэтай яны наведваюць школу, але і выпрацоўвалі правілы паводзін ва ўстанове. Таццяна Анатольеўна прапанавала дзецям розныя сітуацыі, на якія разам знаходзілі адказы. Напрыканцы размовы кожны вучань выказаў меркаванні, якім бачыць адказнага навучэнца і грамадзяніна.

***Еўтуховіч Маргарыта,***
***піянер дружыны імя Колі Гойшыка***

# «Падары дзіцяці свята»



Акцыя «Нашы дзеці» з'яўляецца традыцыйнай напярэдадні Новага года. Дзяцей з няпоўных і шматдзетных сем'яў, дзяцей-сірот віншуе Дзед Мароз і Снягурка. У гэтым годзе акцыя праходзіць пад дэвізам «Падары дзіцяці свята». Казачныя героі імкнуцца не пакінуць без увагі ні воднага дзіцяці, выканаць запаветнае жаданне кожнага.

Навучэнцы нашай школы Папека Анастасія і Чычко Анастасія таксама сустрэліся з Дзедам Марозам і Снягуркай. За высокія дасягненні ў творчых конкурсах і спорце добрыя чараўнікі павіншавалі дзяўчынак з надыходзячым Новым годам, пажадалі ім моцнага здароўя і дасягнення пастаўленых мэтаў, а таксама падрыхтавалі для іх падарункі.

***Нагорная Дар'я, член БРСМ***

# ГАРТАЕМ 2020













Ганцавіцкі раён
в.Дзяніскавічы
вул. Леніна 93а
Тэлефон: 8 0164651138
Сайт: https://deniskovichi.schools.by
E-mail: deniskovichi@gancevichi.edu.by

«Піянерская паляна»
Тыраж 4 экзэмпляры
Выданне надрукавана
на прынтэры фармата А4

2020 год

Галоўны рэдактар: Лаўрэнцьева І.П.
Рэдактар: Швайка Т.У.
Аўтары: школьны прэс-цэнтр
Рэцэнзент: Берташ Н.І.

ДУА «Дзяніскавіцкі
яслі-сад—сярэдняя школа»